Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

УДК 947.6 "1648-1651" "364"

# Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гадоў на Беларусі: некаторыя вынікі даследавання

С. А. Чаропка

Доўгі час тэматыка, звязаная з падзеямі на Беларусі ў сярэдзіне XVII ст., застав… па-за ўвагай айчынных і замежных гісторыкаў, што было звязана з шэрагам аб'ектыў… суб'ектыўных прычын. У беларускай савецкай гістарыяграфіі трывала замацав… меркаванне аб выключна антыфеадальным характары вайны 1648–1651 гг. Айчы… гісторыкі савецкага перыяду часта разглядалі сацыяльныя і палітычныя працэ… абазначаны перыяд праз прызму класавай барацьбы і спрадвечнага імкнення беларус… народа да інтэграцыі з рускім народам у адзіную дзяржаву, пакідаючы пры гэтым ін… фактары па-за ўвагай [1–5]. Беларускія і замежныя гісторыкі XIX–XX ст. нярэдк… вылучалі падзей на Беларусі сярэдзіны XVII ст. з агульнага ракурсу барацьбы ўкраін… народа, такім чынам, вайна 1648–1651 гг. проста "гублялася" ў цені больш машта… падзей на Украіне [6–15]. З пункту гледжання сучаснай гістарычнай навукі зусім не… падыходы і высновы ранейшай гістарыяграфіі вытрымалі праверку часам, таму … гісторыкі засяроджваліся выключна на асобных фрагментах сацыяльнай барацьбы… закранаючы пры гэтым іншых, якія перашкаджалі цэласнай канцэпцыі класавай бара… Разам з тым, нягледзячы на пэўныя недахопы, менавіта беларускім гісторыкам саве… перыяду належыць першынства ў грунтоўнай распрацоўцы праблематыкі сацыял… барацьбы ў XVII ст.

У 90-х гг. XX ст., з набыццём незалежнасці Рэспублікі Беларусь, у айчы… гістарыяграфіі адбыўся адыход ад панаваўшай звыш 70 гадоў марксісцка-ленін… метадалогіі, што выклікала пэўныя цяжкасці пры правядзенні навуковых даследава… Працэсы дэідэалагізацыі прывялі да плюралізму думак, у выніку чаго з'явіліся н… падыходы да праблемы. Вайна 1648–1651 гг. стала ўяўляцца выключна як антыфеадал… з'ява, а ў пэўных даследаваннях і як антыдзяржаўны мяцеж [16]. Апошні падыхо… даследуемай праблематыкі, на наш погляд, зусім не пазбаўлены праблем ідэалагічнага п… Заканамерны пераход сучаснай гістарычнай навукі на новы ўзровень робіць неабхо… звярнуць пільную ўвагу на некаторыя вельмі важныя для далейшага развіцця беларус… народа фрагменты мінуўшчыны.

Маштабнасць падзей Казацка-сялянскай вайны, яе значэнне для далейшага … беларускага народа робіць даследаванне вайны і асобных яе фрагментаў дастат… актуальным. Новы час дае магчымасць выкарыстаць раней малаўжываныя крын… пераглядзець звесткі ўжо даследаваных дакументаў, прыцягнуць новыя навук… даследаванні і на аснове комплексу крыніц па-новаму паглядзець на падзеі вайны [17–… Навуковая актуальнасць праблемы абумоўлена адсутнасцю работ, у якіх Казацка-сялян… вайна выступае ў якасці самастойнага аб'екта даследавання як у айчыннай, так і ў замеж… гістарыяграфіі.

Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. уяўляе сабой самы яскравы прыклад адкр… сацыяльнай барацьбы на беларускіх землях. Вайна ахапіла значныя тэрыторыі, прыцяг… да ўдзелу велізарныя масы насельніцтва, якія рэпрэзентавалі розныя яго сацыяльныя гру… мелі розныя мэты. Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. стала ўвасабленнем глыбо… цывілізацыйнага крызісу, велізарнай нацыянальнай катастрофы, якая адбылася ў белару… грамадстве ў XVII ст. Менавіта гэтая вайна распачала ў беларускай гісторыі перыяд, … ўкраінскай гістарыяграфіі атрымаў слушную назву "Руіна", а ў польскай гістар… літаратуры – "Патоп". Нягледзячы на тое, што сэнс гэтых тэрмінаў ва ўкраінскай і пол…

навуковай літаратуры не зусім тоесны, тым не менш, для беларускіх зямель ВКЛ, ён фактычна аднолькавы, таму што Беларусь перажыла ў сярэдзіне XVII ст. і ўварванне іназемных замежных армій і, як наступства, сур'ёзна пацярпела ад вайны 1648–1651 гг. і наступнай вайны 1654–1667 гг.

Казацка-сялянская вайна з'яўляецца вынікам перапляцення сацыяльных супярэчнасцей, выражаных у форме рэлігійнай барацьбы. У першай палове XVII ст. у беларускім грамадстве праходзілі складаныя этнічныя працэсы, у выніку якіх саслоўная дыферэнцыяцыя грамадства была ўмацавана этнарэлігійным фактарам. Адбылася палітызацыя рэлігійнага канфлікту, ён стаў успрымацца як міжнацыянальны канфлікт паміж "рускім" і польскім народамі, што ва ўмовах саслоўнай дыферэнцыяцыі набыло рысы канфлікта "рускага" народа з дзяржавай, улада ў якім знаходзілася ў руках "палякаў" [31, с. 33].

Напярэдадні Казацка-сялянскай вайны на беларускіх землях ВКЛ аформіліся два супрацьлеглыя лагеры. Першы лагер прадстаўляла беларускае сялянства, у асяродку якога былі моцныя пратэстныя настроі ў сувязі са збяднennем і ўзмацненнем эксплуатацыі. Да гэтага ж лагера належалі частка мяшчанства і беларускай шляхты, аб'яднаныя разам з сялянствам праваслаўным духавенствам ідэяй барацьбы супраць "чужых" феадалаў за веру і права на свабоднае вызнанне сваёй – "рускай" – рэлігіі. Другі лагер, які канчаткова аформіўся ўжо падчас вайны, рэпрэзентавалі прадстаўнікі беларускай магнатэрыі, каталіцкай, кальвініcцкай, а таксама значнай часткі праваслаўнай шляхты, аб'яднаных ідэяй барацбы супраць уварвання ўкраінскіх казакоў і мясцовых паўстанцаў, за аднаўленне раней існуючага ладу. Да гэтага ж лагеру адносілася беларускае мяшчанства і сялянства уніяцкага веравызнання, а таксама яўрэйскае насельніцтва, якія падвяргалася жорсткаму праследу з боку паўстанцаў [31, с. 34].

Складаная знешнепалітычная сітуацыя, у якой аказалася Рэч Паспалітая ў 1648 г., стварыла спрыяльную кан'юнктуру для актывізацыі апазіцыйных каралеўскаму ураду сіл. Узмацненне феадальнай эксплуатацыі ў першай палове XVII ст. у сукупнасці з уціскам свабоды веравызнання, у спалучэнні з разгарнуўшайся на Украіне Вызваленчай вайной, абвастрыла сацыяльную барацьбу на Беларусі. Уваход казацкіх атрадаў летам 1648 г. на тэрыторыю ВКЛ фактычна паклаў пачатак вайне Запарожскага Войска з ВКЛ 1648–1651 гг. [32, с. 33]. Дзеянні казацкіх падраздзяленняў спрыялі разгортванню сялянскага антыфеадальнага руху і пачатку серыі гарадскіх паўстанняў, у выніку якіх функцыянаванне дзяржаўных органаў улады на тэрыторыі Рэчыцкага, Мазырскага і Пінскага паветаў была паралізавана. На гэтых тэрыторыях летам 1648 г. пачала афармляцца новая сістэма кіравання па казацкаму тыпу, аднак контрнаступленне сіл шляхецкага лагера зімой 1649 г. не дало магчымасці развіцца абазначанаму працэсу [33, с. 33]. Актыўнасць барацьбы паўстанцкага лагеру ў перыяд з восені 1649 да зімы 1651 гг. рэзка знізілася, аднак пачатак вайны ВКЛ з Запарожскім войскам увесну 1651 г. прывёў да актывізацыі дзеянняў паўстанцаў.

Храналагічныя рамкі Казацка-сялянскай вайны складаюць перыяд з чэрвеня 1648 па снежань 1651 гг., што вызначана самім ходам вайны на Беларусі. З'яўленне казацкіх атрадаў на беларускіх землях і звязаныя з гэтым сялянска-мяшчанскія паўстанні дакументальна зафіксаваны летам 1648 г., такім чынам, ніжняя храналагічная мяжа даследавання звязана менавіта з гэтай датай [17, с. 33]. Прыведзенае меркаванне прынята ў айчыннай і замежнай навуковай літаратуры і пярэчанняў не выклікае. Поспехі войска ВКЛ пад кіраўніцтвам Я. Радзівіла летам 1651 г. і падпісанне Белацаркоўскага дагавора ў верасні гэтага ж года прывялі да прыпынення баявых дзеянняў на Украіне і згортвання паўстанцкага руху на тэрыторыі беларускіх паветаў ВКЛ восенню 1651 г. Нягледзячы на аднаўленне Вызваленчай вайны ўкраінскага народа ў 1652–1654 гг., на беларускіх землях ВКЛ паўстанцкі рух не атрымаў распаўсюджання да 1654 г, калі пачынаецца вайна Расіі з РП. Менавіта таму, у якасці верхняй храналагічнай мяжы неабходна лічыць восень 1651 г.

У ходзе Казацка-сялянскай вайны мэтазгодна выдзеліць тры асноўныя перыяды. На першым перыядзе з чэрвеня 1648 па студзень 1649 гг. праходзіла распаўсюджванне казацкіх загонаў на Беларусі і, адпаведна, сялянскага руху і мяшчанскіх паўстанняў. У другі перыяд

са студзеня да жніўня 1649 г. адбыўся карэнны пералом у ходзе вайны, шляхецкі ла… перайшоў на контрнаступлення, у выніку якога казакі былі выцеснены з заходн… цэнтральнабеларускіх паветаў ВКЛ . З мая па жнівень 1651 г. праходзіў трэці перыяд вай… звязаны са спробамі казацкіх атрадаў рэаніміраваць сацыяльную барацьбу на Беларусі.

Ход Казацка-сялянскай вайны на Беларусі ў значнай меры залежаў ад знеш… фактараў. У прыватнасці прасочваецца цесная залежнасць дынамікі сацыяльнай барацьбы … Беларусі ад падзей, якія праходзілі на тэрыторыі суседняй Украіны. З падыходам асноўн… сіл казацкага войска Хмяльніцкага напрыканцы мая 1648 г. да Белай Царквы і з’яўле… казацкіх атрадаў у Рэчыцкім і Мазырскіх паветах спрыяла разгортванню летам 164… сялянскіх і мяшчанскіх паўстанняў у паўднёва-ўсходняй Беларусі, што паклала пача… Казацка-сялянскай вайне. У верасні 1648 г. войска запарожскага гетмана падышл… Піляўцаў, што прывяло да значнага пашырэння зоны дзеяння казацка-сялянскіх атра… Беларусі за кошт іх паралельнага прасоўвання ў Пінскі і Берасцейскі паветы. Актывіза… казацкіх сіл на Украіне вясной 1649 г. і паход Б.Хмяльніцкага на Збараж у чэрвені 16… адбіліся абвастрэннем сацыяльнай барацьбы на Беларусі.

Разам з тым, падзеі на Беларусі таксама аказвалі істотны ўплыў на ход Вызвален… вайны ўкраінскага народа. Поспехі войска ВКЛ у студзені – лютым 1649 г. паставілі каза… войска пад пагрозу ўдара з тылу шляхецкімі фарміраваннямі. Гэта прымушала казац… кіраўніцтва падзяляць свае сілы і аслабляць сваё войска на асноўным накірунку бая… дзеянняў. У прыватнасці, гэта праявілася ў высылцы загона І. Галоты на Беларусь у чэр… 1649 г. і адпраўцы войска М. Крычэўскага пад Лоеў у вельмі адказны для Хмяльніц… момант – падчас аблогі Збаражу.

Значны ўплыў на ход Казацка-сялянскай вайны аказала Расійская дзяржава. У х… вайны адбылася эвалюцыя стаўлення расійскага ўрада да ўнутранай вайны ў РП і эвалю… стаўлення Расійскай дзяржавы да казацкага руху на Украіне і Беларусі ад нейтрал… негатыўнага да зближэння з казацкім кіраўніцтвам. У 1651 г. Расія пераходзіць да адкр… падтрымкі казакоў, што адлюстравалася ў прадстаўленні казакам калідору для праходу … тэрыторыі з мэтай удару па ўнутраным раёнам ВКЛ. Не прымаючы удзелу ў ба… дзеяннях, яна тым не менш сваёй палітыкай у адносінах да ВКЛ як часткі РП зр… спрыяльныя ўмовы для дзеянняў казакоў, распаўсюджання сялянскага паўстання і пач… Казацка-сялянскай вайны на Беларусі.

У Казацка-сялянскай вайне прынялі ўдзел прадстаўнікі розных сацыяльных груп, … мелі розныя мэты і інтарэсы. Для сялянска-мяшчанскіх мас вайна мела хара… антыфеадальнай барацьбы, для праваслаўнай шляхты, якая далучылася да паўстанц… вайна насіла рысы грамадзянскай вайны.

Казацка-сялянская вайна прывяла да сур’ёзных разбурэнняў на Беларусі, праходзіў… выглядзе трох хваляў, якія храналагічна супадаюць з перыядамі вайны. Баявыя дзе… прывялі да значнага скарачэння насельніцтва на Беларусі, асабліва ў паўднёва-ўсхо… рэгіёнах і да заняпаду гаспадарчага жыцця. Дзеянні казакоў на Украіне і сумесныя іх дзе… з паўстанцамі на Беларусі, у сукупнасці з барацьбой на соймах праваслаўнай шля… прымусілі каралеўскі ўрад пайсці на пэўныя саступкі ў рэлігійнай сферы. Было пры… права праваслаўнага насельніцтва на свабоднае вызнанне сваёй канфесіі і … праваслаўнай шляхты на роўныя з католікамі правы на дзяржаўныя пасады. Але ў найбо… прынцыповым пытанні аб ліквідацыі уніі каралеўскі ўрад застаўся непахісным і на саст… не пайшоў. Гэтыя палітычныя саступкі, выражаныя ў рэлігійным ракурсе, ніяк не паўплы… на змену ў грамадскім ладзе на Беларусі [34, с. 33]. У знешнепалітычным плане непасрэд… вынікам Казацка-сялянскай вайны на Беларусі з’яўляецца аслабленне пазіцый Р… зацягнуўшайся спрэчцы з Расійскай дзяржавай аб праве на спадчыну Старажытнай Русі… падрыхтавалу глебу для далейшай агрэсіі Расіі на беларускія землі ВКЛ у 1654–1667 гг.

**Abstract.** Some results of investigation of Cossack-peasant war of 1648-1651 in Bela… presented in the paper.

**Літаратура**

1. Абецедарский, Л. С. Белоруссия и Россия. Очерки русско-белорусских связей второй половины XVI–XVII в. / Л. С. Абецедарский. – Мн. : "Вышэйш. школа", 1978. – 256 с.

2. Игнатенко, А. П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. (Вторая половина XVII – XVIII в.) / А. П. Игнатенко. – Мн. : Изд-во БГУ, 1974. – 192 с.

3. Лочмель, И. Ф. Очерк истории борьбы белорусского народа против польских панов / И. Ф. Лочмель. – М. : Воениздат, 1940. – 164 с.

4. Шуляковский, Х. Г. Из истории борьбы белорусского народа с польским панством в XVII веке / Х. Г. Шуляковский // Уч. записки Ленинград. гос. ун-та. – 1940. – Т. 67. – С. 94–116.

5. Шчарбакоў, В. К. Класавая барацьба і гістарычная навука на Беларусі / В. К. Шчарбакоў. – Мн. : Выд-ва Бел. Акад. навук, 1934. – 105 с.

6. Артюшевский, О. П. Совместная антикрепостническая борьба трудящихся масс России, Украины и Белоруссии: вторая половина XVI – 60-е годы XVII ст. / О. П. Артюшевский – К. : "Вища школа", 1987. – 154 с.

7. Бярнацкі, В. Паўстаньне Хмяльніцкага: Васнныя дзеньні ў Літве ў 1648–1649 гг. / В. Бярнацкі// ARCHE = Пачатак. – 2008. – №3. – С. 45–222.

8. Голобуцкий, В. А. Россия и освободительная война украинского народа 1648–1654 гг. / В. А. Голобуцкий. – М. : Госполитиздат УССР, 1954. – 100 с.

9. Грушевський, М. Історія України-Русі / М. Грушевський. Т. VIII. Розділ XIII // http://www.litopys.org.ua

10. Костомаров, Н. И. Материалы и исследования. Богдан Хмельницкий / Н. И. Костомаров. – М. : "Чарли", 1994. – 768 с.

11. Похилевич, Д. Л. Белорусское казачество / Д. Л. Похилевич // Наукові записки Львівського державного ун-та ім. Ів. Франка. – Т. XLIII. – Вип. 6. – 1957. – С. 145–172.

12. Kotłubaj, E. Życie Janusza Radziwiłła/ E. Kotłubaj. – Wilno–Witebsk, 1859. – 460 s.

13. Lipiński, W. Stanisław Michał Krzyczewski. Z dziejów walki szlachty ukraińskiej w szeregach powstańczych pod wodzą Bohdana Chmelnickiego/ W. Lipiński. – Kraków, 1912. – VIII, 375 s.

14. Lietuvos valstybė XII–XVIII a.: Str. rynkinys / Lietuvos istorijas institutos; Red. kol. Z Kiaupa. – Vilnius : Liet. istorijos inst., 1997. – 580 p.

15. Morzy, J. Kryzis demograficzny na Litwie i Białorusi w 2 połowie XVII wieku / J. Morzy – Poznań, 1965. – 405 s.

16. Чаропка, В. Уладары Вялікага княства / В. Чаропка. – Мн. : Полымя, 1996. – 638 с.

17. Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографическою комиссиею (АЮЗР). – СПб. : в тип. П. А. Кулиша, 1861. – Т. 3. – 604, 34, 22 с.

18. Гакоген, С. Послание/ С. Гакоген // Еврейские хроники XVII столетия: (Эпоха "Хмельничины"). – М. ; Иерусалим : Гешарим, 1997. – 287 с. – С. 183–191.

19. Дневник Богуслава Машкевича. 1643–1649 // Мемуары, относящиеся к истории Южной Руси. Вып. II.(первая половина XVII ст.). Под ред. В. Антоновича. – К. : Тип. Г. Т. Корчак-Новицкого, 1896. – С. 406–438.

20. Львоўская навуковая бібліятэка Нацыянальнай акадэміі навук Украіны ім. Стэфаніка (ЛНБ). – Ф. Асалінскіх – Спр. 225/II. – Арк. 137 аб.

21. Манифест ксендзов францисканцев пинских// О бунте города Пинска и усмирении онаго. – М. : В Университетской тип., 1847. – С. 37–38.

22. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. – Воп. 4. – Спр. 9. Арк. 55–55 аб.

23. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў Гродне (НГАБ у Гродне). – Ф. 1663 Воп. 1. – Спр. 411. – Арк. 68–69.

24. Протокол Пинского гродского суда освидетельствования и представления части

тела кс. Доминика Холевского проповедника// О бунте города Пинска и усмирении онаго. – М. : В Университетской тип., 1847. – С.35–36.

25. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў (РДАСА). – Ф. 79. 1651. – Воп. I. – Спр. 16. – Ч. 1. – Арк. 100.

26. Щоденнік невідомого автора з війська князя Радзивіла про хід боїв на Поліссі (1649. 30 – лютого 10)// Сіверянський літопис. – 1999. – №2. – С. 17–20.

27. Kochowski, W. [H.] Annalium Poloniae. Climacter tertius. Ad punctum abdicationis Joannis Casimiri Rex per Regnum Poloniares gesnas / W. [H.] Kochowski. – Cracoviae: Ex officina Georgii et Nicolae Schedel, 1698. – /6/ f., 343 p.

28. Pamiętniki Albrychta Stanisława X. Radziwiłła kanclerza W. Litowskiego Wydane z rękopismu przez Edwarda Raczyńskiego. T. 2. – Poznan : U braci Scherków, 1889. – 490 s.

29. Pastorius, J. Bellum Scithico-Cosacicu seu de conjuratione Tartarorum cosacorum et plebs Russicae contra Regnum Poloniae ab Invictissimo Poloniae et Sveciae Rege Joanne Casimiro profligata Narratio Plenioris Historiae operi praemissa / J. Pastorius. – Dantisci /Gdańsk/: sumptibus Georgij Försteri, 1652. – 296 p.

30. Rudawski, W. J. Historia Polski od śmierci Władysława IV aż do pokoju Oliwskiego czyli dzeje panowania Jana Kazimierza od 1648 do 1660 r. / W. J. Rudawski. – Petersburg, Mohilew: Wolff, 1855. – T.1 – 188 s.

31. Чаропка, С. А. Вывучэнне Казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гадоў на Беларусі / С. А. Чаропка // Гісторыя: праблемы выкладання. – 2005. – №1. – С. 32–35.

32. Чаропка, С. А. Казацка-сялянская вайна на Палессі ўлетку 1648 года / С. А. Чаропка // Извест. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2005. – № 2 (29). – С. 138–141.

33. Чаропка. С. А. Спробы афармлення казацкіх палкоў на Беларусі ў сярэдзіне XVII ст. / С. А. Чаропка // Изв. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2008. – №4(49). – С. 59–63.

34. Чаропка, С. А. Наступствы Казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. для Беларусі (дэмаграфічны і гаспадарчы аспекты) / С. А. Чаропка // Извест. Гом. гос. ун-та им. Ф. Скорины. – 2008. – №4(49). – С.17–25.

Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Ф. Скарыны

Поступило 16.06.